Г.В. Харольская,
метадыст аддзела міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Методыка правядзення практычных заняткаў па арганізацыі анімацыйных праграм

Анімацыя як кірунак акцёрскай дзейнасці для Беларусі не новы, хаця яго выкарыстанне ў дзейнасці арганізацый сферы культуры яшчэ не набыло шырокага распаўсюджання. Калі ў краіне пачала фарміравацца сістэма, якая прапануе чалавеку поўны спектр забаўляльных заняткаў (індустрыя вольнага часу), то ў лексікон арганізатараў святочных мерапрыемстваў і ўвайшло паняцце «анімацыя».

Сёння ў культурна-адпачынкавай дзейнасці велізарная разнастайнасць форм і жанраў відовішчнай прадукцыі: канцэртныя, музычныя, гутарковыя, гульнёвыя, тэатралізаваныя, цыркавыя, конкурсныя, анімацыйныя і іншыя прадстаўленні. Кожны від культурна-відовішчнага мерапрыемства характарызуецца сваім зместам і формай, якія вызначаюць асаблівасці жанру, тэхналогіі і методыкі арганізацыі [1].

Анімацыйныя праграмы — гэта сінтэз гульнёвай дзейнасці і эстраднага жанру, у аснове драматургіі якога ляжыць прынцып вобразнага рашэння, а ў аснове кампазіцыі — мантаж асобных конкурсаў і гульняў [3]. Арганізацыя анімацыйных праграм дае магчымасць аб'яднаць значную колькасць людзей, садзейнічае іх актывізацыі.

Мэта анімацыі — прыцягненне ўвагі да святочнага мерапрыемства, стварэнне добрага настрою і пазітыўнага стаўлення да таго, што адбываецца, далучэнне гасцей свята да дзеяння і ператварэнне іх з пасіўных гледачоў у непасрэдных удзельнікаў.

Анімацыйныя праграмы выконваюць важную ролю ў правядзенні мерапрыемстваў клубнымі ўстановамі рэспублікі, у тым ліку для рознаўзроставых катэгорый насельніцтва.

У Інбелкульце вывучэнне пытанняў арганізацыі анімацыйных праграм праводзіцца ў працэсе рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі спецыялістаў-арганізатараў культурна-адпачынкавай дзейнасці: «Сацыякультурны менеджмент і тэндэнцыі развіцця сферы вольнага часу» (для дырэктараў, намеснікаў дырэктараў, загадчыкаў аддзелаў (сектараў) гарадскіх і раённых дамоў культуры, абласных, гарадскіх і раённых метадычных цэнтраў), «Сучасныя тэхналогіі правядзення масавых свят і прадстаўленняў» (для галоўных рэжысёраў, рэжысёраў, культарганізатараў культурна-асветных устаноў), «Арганізацыя вольнага часу рознаўзроставых катэгорый насельніцтва» (для мастацкіх кіраўнікоў клубных устаноў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Задача практычнага занятка заключаецца ў актывізацыі творчай дзейнасці слухачоў. Форма і метады правядзення кожнага занятка залежаць ад яго мэты, тэматыкі і наяўнасці патрэбных сродкаў навучання. У цэнтры ўвагі знаходзяцца і пытанні тэорыі, і адпрацоўка практычных уменняў і навыкаў, што асабліва важна і надзвычай каштоўна для росту прафесійнага майстэрства.

Эфектыўнасць практычных заняткаў залежыць не толькі ад прадуманага планавання, але і ад методыкі іх правядзення, якая звычайна ўключае тры асноўныя этапы.

Першы этап — падрыхтоўчы, падчас яго вызначаюцца, у залежнасці ад кожнай асобнай групы слухачоў, задачы практыкуму, рыхтуецца план работы, падбіраюцца найлепшыя анімацыйныя праграмы з вопыту работы выкладчыка.

Другі этап — асноўны, у ходзе яго слухачы знаёмяцца з канкрэтнымі элементамі анімацыйных праграм, схемамі іх падрыхтоўкі, асаблівасцямі рэпетыцыі, вядуць актыўную творчую работу па перайманню манеры вядзення анімацыйнай праграмы.

Трэці, заключны этап уяўляе сабой падвядзенне вынікаў і адказы на пытанні.

На кожным з дадзеных этапаў вялікую ролю адыгрывае ўзровень зацікаўленасці слухачоў у засваенні матэрыялу і далейшым яго выкарыстанні ў прафесійнай дзейнасці.

Сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў складаецца не толькі з таго, якія веды слухач атрымлівае ў працэсе навучання. Для павышэння пазнавальнай актыўнасці слухачоў на занятках прымяняюцца адмысловыя метадычныя прыёмы:

пастаноўка пытанняў;

уключэнне элементаў мазгавога штурму;

прапанова сфармуляваць умовы конкурсу;

вызначыць мэтазгоднасць правядзення анімацыйнай праграмы для пэўнага ўзросту гледачоў;

выкарыстанне сродкаў нагляднасці, гульнёвага рэквізіту і інш.

Яшчэ адной умовай паспяховасці з’яўляецца выкарыстанне інтэрактыўных форм і метадаў.

У шырокаўжывальных у апошні час у тэорыі і практыцы адукацыі тэрмінах «інтэрактыўныя метады», «інтэрактыўная педагогіка», «інтэрактыўнае ўзаемадзеянне» вядучай характарыстыкай з’яўляецца «ўзаемадзеянне», а ўжыванне азначэння «інтэрактыўны» падкрэслівае іх альтэрнатыўнасць традыцыйным метадам [2].

Каштоўнасць інтэрактыўнага падыходу ў тым, што ён забяспечвае зваротную сувязь, адкрыты абмен думкамі, фарміруе станоўчыя адносіны паміж удзельнікамі групы. Стрыжнем дадзеных форм работы з кадрамі з’яўляюцца калектыўныя абмеркаванні, разважанні, аргументацыя высноў, спаборніцтва розумаў і талентаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне інтэрактыўных метадаў — у вырашэнні такіх найважнейшых задач, як:

стымуляванне цікавасці і матывацыі да самаадукацыі;

павышэнне ўзроўню актыўнасці і самастойнасці;

развіццё навыкаў аналізу і рэфлексіі сваёй дзейнасці;

эмпатыя, развіццё імкнення да супрацоўніцтва.

У ліку задач прымянення інтэрактыўных форм вылучаюцца наступныя: актывізацыя творчай дзейнасці, пабуджэнне да творчага мыслення, пошук нестандартнага выхаду з праблемнай сітуацыі.

Інтэрактыўныя метады навучання заснаваны на добра арганізаванай зваротнай сувязі суб'ектаў і аб'ектаў адукацыі, двухбаковым абмене інфармацыяй паміж імі. У цэлым, працэс навучання работніка культуры анімацыйным праграмам у рамках павышэння кваліфікацыі арыентаваны на развіццё яго асобы, асэнсаванне ім сутнасці крэатыўнай дзейнасці.

Пры правядзенні практычных заняткаў па арганізацыі анімацыйных праграм з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў прынцыпова важна стварыць умовы для праяўлення слухачамі самастойнасці, свабоды творчага самавыяўлення. Таму адукацыйны працэс скіраваны не на вывучэнне і засваенне гатовых сцэнарыяў, а на знаёмства з прынцыпамі і метадамі стварэння анімацыйных праграм, з тым каб слухач атрымаў навыкі распрацоўкі ўласных анімацыйных праграм.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Киселева, Т.Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т.Г. Киселева, Ю.Д. Красильников. — М. : МГУКИ, 2004. — 539 с.
2. Краткий словарь иностранных слов / сост. С.М. Локшина. — 4-е изд., испр. — М. : Сов. энцикл., 1974. — 351 с.
3. Социально-культурная анимация : учеб. пособие / Н.Н. Ярошенко. — 2-е изд., испр. и допол. — М. : МГУКИ, 2005. — 126 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ